ансамблі. Калі салісту гэта не ўдаецца, падкажыце яму момант пачатку бліжэйшага раздзелу твора, вядомага па рэпетыцыі. Спеваку, які забыў тэкст, падкажыце патрэбнае слова.

6. Заўсёды акампаніруйце спевакам так, каб яны маглі спяваць без напружання. Сачыце за дынамічнай раўнавагай паміж спеваком і аркестрам, што забяспечыць успрыняцце тэксту слухачамі.

Кантрольныя пытанні:

1. У якіх выпадках выкарыстоўваюцца жэсты, якія адлічваюць і якія гучаць?
2. Калі абавязковы адлік паўзіруючых тактаў?
3. У чым асаблівасць акампанементу салісту-вакалісту?

РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА:

1. Исполнительское искусство зарубежных стран: Сб.статей. - Вып.3. - М.: Музыка, 1967. - С.183.
2. Современные дирижеры. - М.: Сов.комп., 1969. - С.195.
3. Римский-Корсаков Н.А. Основы оркестровки. - М.: Музгиз, 1946. - С.97.

## РЭКАМЕНДАЦЫІ КІРАЎНІКАМ САМАДЗЕЙНЫХ АРКЕСТРАЎ НАРОДНЫХ ІНСТРУМЕНТАЎ ПА ПАДБОРУ РЭПЕРТУАРУ

Гэтыя рэкамендацыі маюць на мэце дапамагчы кіраўнікам у падборы рэпертуару для самадзейных аркестраў народных інструментаў, што атрымалі распаўсюджанне ў Беларусі. Калектывы гэтыя вельмі разнастайныя па інструментальнаму саставу: цымбальныя, домрава-балалаечныя, аркестры гармонікаў (баянаў), змешаныя. Як вядома, адной з асноўных праблем, якія садзейнічаюць або тармозяць паспяховае развіццё самадзейнага народна-аркестравага выканання, з'яўляецца праблема рэпертуару. Цікавы і разнастайны рэпертуар прыцягвае ў самадзейнасць новых яе удзельнікаў, павышае стабільнасць аркестраў, аказвае вялікае выхаваўчае і развіваючае ўздзеянне на самадзейных музыкантаў. Народным аркестрам у цяперашні час даступныя для выканання сусветная музычная класіка, апрацоўкі народных мелодый, а таксама савецкая і замежная эстрада. Рэпертуар становіцца вызначальным фактарам у выбары творчага напрамку калектыву. Менавіта таму працэс падбору яго з'яўляецца вельмі адказным і працаемкім для кіраўнікоў самадзейных аркестраў народных інструментаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Савецкімі выдавецтвамі выпускаюцца серыі зборнікаў партытур для самадзейных калектываў, аднак многія кіраўнікі не могуць з імі азнаёміцца з-за недахопу інфармацыі. Мы паспрабавалі ў гэтай рабоце каратка асвятліць самыя асноўныя выданні нотнай літаратуры для АНІ[1]. Характарыстыка яе праводзіцца па дзвюх групах: выпускі саюзных і рэспубліканскіх выдавецтваў. Асобна выдзелены зборнікі, адрасаваныя дзіцячым калектывам. Аб кожным зборніку даюцца наступныя звесткі: інструментальны састаў аркестра, на які разлічаны партытуры таго ці іншага зборніка, аўтары твораў, ступень складанасці п"ес, а таксама наяўнасць метадычных указанняў або тлумачэнняў да іх.

Каб аблегчыць пошукі таго ці іншага зборніка (у бібліятэках нотна-гарадскіх, музычных навучальных устаноў і інш.), дадзена дакладнае бібліяграфічнае апісанне кожнага з іх у Спісе рэпертуарных зборнікаў, а спасылкі на яго ў тэксце пазначаны цыфрай.

Рэпертуарныя зборнікі цэнтральных выдавецтваў

Зварот да рэпертуарных зборнікаў цэнтральных выдавецтваў дазваляе кіраўнікам беларускіх аркестраў быць знаёмымі з працэсамі, якія адбываюцца ў іншых саюзных рэспубліках, новымі арыгінальнымі музычнымі творамі і аркестроўкамі. У агляд увайшлі партытуры для аркестраў народных інструментаў[1], выдадзеныя ў пасляваенны перыяд. У мірны час адкрыліся шырокія магчымасці для аматарскай дзейнасці. З"явілася вялікая колькасць самадзейных ансамбляў і аркестраў народных інструментаў у клубах, дамах культуры і навучальных установах. Але аматары народна-інструментальнай музыкі адчувалі вялікія цяжкасці пры падборы рэпертуару з-за недахопу нотных выданняў.

Вядомы педагог і выканаўца на домры А.Дарожкін паклаў пачатак выданню ў музычным дзяржаўным выдавецтве серыі зборнікаў партытур пад назвай "П"есы для пачынаючых АРНІ" (23). У перыяд з 1958 па 1968 год выйшла адзінаццаць выпускаў такіх зборнікаў з прыкладаннем аркестравых галасоў. Яго ж рэпертуарны зборнік

---

1 У гэтай рабоце прыняты наступныя скарачэнні: АНІ - аркестр народных інструментаў, АРНІ - аркестр рускіх народных інструментаў (домрава-балалаечны састаў).

2 Аналіз нотнай літаратуры для ансамбляў народных інструментаў уключыць у гэты артыкул няма магчымасці з-за абмежавання яго аб"ему.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

"П"есы для пачынаючага АРНІ", выдадзены "Советским композитором" у 1969 г., змяшчаў п"есы-практыкаванні ва унісоннай ігры, п"есы першапачатковай і сярэдняй ступені складанасці (22).

У выдавецтве "Музыка" у 70-я гады выходзіла серыя "Клубнаму АРНІ" (15), а з 1981 г. - серыя "Рэпертуар клубнага АРНІ" (43), якая з"явілася працягам першай. Абедзве серыі адрасаваліся калектывам мастацкай самадзейнасці. Складальнікам іх з"яўляецца В.Віктараў. Рэпертуар у іх самы разнастайны: заходняя, руская і савецкая класіка, замежная і савецкая эстрада, апрацоўкі народных песень і танцаў, акампанемент для салістаў. Інструментальны састаў аркестра уніфіцыраваны і стабільны ў партытуры: домравая і балалаечная групы, два баяны і некалькі ударных. Творы разлічаны на самы розны ўзровень выканання - ад пачынаючых да больш зрушаных у тэхнічных адносінах аркестраў. Аўтарам- складальнікам рэалізуецца прынцып даступнасці матэрыялу, таму выкарыстоўваюцца спрашчэнні ў групе балалаек і домраў, якія, аднак, не зніжаюць мастацкай каштоўнасці твора. Адметна тое, што акрамя партытуры друкуюцца аркестравыя галасы (па аднаму экземпляру для кожнай аркестравай партыі).

З 1970 па 1977 г. выдавецтвам "Советский композитор" выпушчана 7 зборнікаў партытур "П"есы для самадзейнага АРНІ" (33), ускладальнікі якіх - вядомыя кампазітары і музыканты-выканаўцы: А.Шырокаў, Л.Любімаў, Б.Глыбоўскі, В.Гаўрылаў, С.Дунаеўскі. Ў адрозненне ад зборнікаў, складзеных В.Віктаравым, у гэтай серыі выкарыстоўваецца розны інструментальны састаў аркестра, нярэдка уводзяцца гуслі або драўляныя духавыя інструменты сімфанічнага аркестра. Акрамя аркестравых апрацовак народных мелодый і пералажэнняў класікі, у рэпертуар увайшлі арыгінальныя творы савецкі кампазітараў, напрыклад: "Аленчына возера" і "Ля Калінава маста" У.Пікуля, "Уверцюра" А.Холмінава і інш. А 7-ы выпуск гэтай серыі складзены С.Дунаеўскім з твораў дзіцячага і маладзежнага рэпертуару: песень А.Пахмутавай, А.Астроўскага, Д.Кабалеўскага, У.Шаінскага і інш.

Можна рэкамендаваць самадзейным і вучэбным аркестравым калектывам выпушчаныя выдавецтвам "Советский композитор" зборнікі партытур "Іграе Дзяржаўны АРНІ імя М.Осіпава" (6) у трох выпусках, паколькі многія п"есы, апублікаваныя ў іх, могуць быць выкананы і самадзейнымі калектывамі. Напрыклад: В.Дзітэль "Карабейнікі", А.Масалоў "Вячэрні звон", Г.Свірыдаў "Дзве

ілюстрацыі да аповесці А.С.Пушкіна "Мяцеліца" - "Водгукі вальса" і "Тройка".

Можна выконваць вучэбнымі і самадзейнымі аркестрамі творы, якія ўвайшлі ў зборнікі партытур з рэпертуару АРНІ Цэнтральнага тэлебачання і Ўсесаюзнага радые. Ў выдавецтве "Советский композитор" гэтыя зборнікі называліся або "Іграе аркестр пад кіраўніцтвам У.Федасеева" (9), або "Іграе АРНІ Цэнтральнага тэлебачання і Ўсесаюзнага радые" (10).

Паралельна ў выдавецтве "Музыка" выходзілі зборнікі "З рэпертуару Дзяржаўнага АРНІ імя М.Осіпава" (13) і "З рэпертуару АРНІ Ўсесаюзнага радые і тэлебачання" (11). Многія творы з ліку апублікаваных у іх можна рэкамендаваць для выканання аркестравай самадзейнасцю. Больш складаныя творы, пры дастаковай кваліфікацыі кіраўніка аркестра, могуць быць пераложаны з некаторымі спрашчэннямі для самадзейнага аркестра[1].

З 1970 г. пачала выдавацца серыя "З рэпертуару Дзяржаўнага акадэмічнага рускага народнага хору імя Пятніцкага", у зборніках якой апублікаваны партытуры твораў для хору з аркестрам, салістаў з аркестрам, музыкі для танцаў (14). Складальнікам з 1-га па 6-ы выпуск з"явіўся А.Шырокаў, а 7-га і наступных - І.Аблікін.

Значную ролю ў выданні нотнай літаратуры для АНІ адыгрывае і Ленінградскае аддзяленне выдавецтва "Музыка". Так, у 1971 г. быў выдадзены зборнік партытур "П"есы для АРНІ" (27), у 1976 г. - партытуры "З рэпертуару АРНІ імя У.Андрэева" (12), складальнікам якіх з"явіўся М.Сяліцкі, а ў 1972 г. - "П"есы для самадзейнага АРНІ" (32), складальнік Г.Андрушэнкаў. З 1981 па 1985 г. пад рубрыкай "Мастацкай самадзейнасці" выйшла пяць выпускаў зборнікаў "П"есы для АРНІ" (28-30). Іх складальнікі - вядомыя педагогі, музыканты і кампазітары В.Акуловіч, М.Шахматаў, В.Біберган, Н.Лебедзеў.

Серыя "П"есы ленінградскіх кампазітараў для АРНІ" (12) знаёміць з творчасцю сучасных ленінградскіх кампазітараў ў жанры народна-аркестравай музыкі. Ў перыяд з 1975, калі выдадзены першы выпуск гэтай серыі, падрыхтаваны Г.Глыбоўскім, па 1983 год выйшла сем выпускаў. Ў іх змешчаны творы для дзвюх

---

[1] Спосабы аблягчэння партытур разгледжаны ў артыкуле Л.Таіравай гэтага дапаможніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтаваных у музычна-тэхнічных адносінах выканаўцаў.

Значную ролю заклікана адыграць "Анталогія літаратуры для АРНІ" (2), у якой публікуюцца ў гісторыка-храналагічным парадку партытуры твораў заснавальнікаў народнага аркестра В.Андрэева, М.Фаміна, Ф.Німана, С.Крукоўскага, П.Каркіна, творы М.Будашкіна, С.Тулікава, П.Трыодзіна, Р.Фрыда і іншых савецкіх кампазітараў. Трэба падкрэсліць сталае значэнне гэтага выдання, якое ўзнаўляе поўную карціну станаўлення рэпертуару для АРНІ ў працэсе развіцця народна-аркестравага выканання. Анталогія пачала выдавацца з 1984 г., яе складальнік – С.Калабкоў.

Улічваючы патрэбнасці ў нотнай літаратуры аматараў ігры на гармоніках, цэнтральныя выдавецтвы выпусцілі шэраг зборнікаў для баяна-акардэонных аркестраў. Так, у 60-я гады выйшлі два выпускі партытур "П"есы для аркестра баяністаў" у інструментоўцы П.Смірнова, а ў 1973 г. – трэці выпуск гэтага ж зборніка (24). З 1970 г. сталі рэгулярна выдавацца зборнікі серыі "П"есы для аркестра баянаў (гармонікаў)" пад агульнай рэдакцыяй Я.Максімава (25). У яе ўключаны творы замежнай, рускай і савецкай класікі, музыка з кінафільмаў у пералажэнні для аркестра баянаў, а таксама творы, напісаныя спецыяльна для аркестра дадзенага саставу, напрыклад, "25 акварэлей" Ю.Шышакова. Ступень складанасці твораў самая розная: ад невялікіх п"ес, разлічаных на выкананне пачынаючымі або дзіцячымі калектывамі да твораў, што патрабуюць высокапрафесіянальнай падрыхтоўкі аркестрантаў. Складальнікі зборнікаў гэтай серыі – вопытныя педагогі-музыканты і дырыжоры: 1-8-га – І.Аблікін, Л.Дзянчэнка, Б.Акімаў, М.Алфееў, С.Стаскоў, А.Чарных, А.Гацэнка, А.Суркоў; 9-16-га – В.Гаўрылаў.

Рэпертуарна-рэдакцыйная калегія ўпраўлення культурна-асветных устаноў Міністэрства культуры СССР выдавала серыю "Інструментальна-аркестравыя творы" для калектываў мастацкай самадзейнасці. У гэтай серыі была выдадзена сюіта "Пад сонцам Радзімы" А.Агафонава (М., 1982), якая складаецца з апрацовак народных мелодый 15 саюзных рэспублік, і "Карагод дружбы" Т.Смірновай (М., 1983). Апошні твор – гэта невялікая сюіта ў пяці частках, у кожнай з якіх (акрамя першай) выкарыстаны сапраўдныя народныя інтанацыі: украінская, беларуская, туркменская і эстонская. Перад партытурай сюіты дадзены метадычныя

указанні самога кампазітара, у якіх тлумачыцца змест кожнай часткі сюіты, даюцца парады па увасабленню вобразау твора сродкамі аркестра.

У наступныя гады Рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіяй упраўлення культурна-асветных устаноў Міністэрства культуры СССР выдаюцца партытуры наступных твораў: С.Мага "Маладзежная уверцюра" і "Напеў" (М., 1987), Д.Шагдарон "Бурацкія замалеўкі" – сюіта для АРНІ (М., 1987).

## Рэпертуарныя зборнікі беларускіх выдавецтваў

Дапамога рэспубліканскіх выдавецтваў аркестравай самадзейнасці да сярэдзіны 60-х гадоў была нязначнай. Зрэдку з'яўляліся невялікія брашуркі з адной-дзвюма п"есамі. Толькі ў 1959 г. Дзяржвыдавецтвам БССР[1] быў выпушчаны зборнік партытур "П"есы для аркестра народных інструментаў" пад агульнай рэдакцыяй К.Паплаўскага (34), у які ўвайшлі творы беларускіх савецкіх кампазітараў у інструментоўцы Г.Жыхарава, апрацоўкі народных мелодый Г.Жыхарава і П.Падкавырава, "Полька" К.Паплаўскага. П"есы інструментаваны для аркестра домрава-балалаечнага саставу з увядзеннем баянаў і ударных інструментаў. У 1961 г. выдадзены "Два беларускія танцы для народнага аркестра" (4). Абодва танцы ("Янка" у апр. А.Граса і "Каза" у апр. П.Кірыльчанкі) інструментаваны М.Лісіцыным.

У 1963 г. Белдзяржвыдавецтва было рэарганізавана і перайменавана у выдавецтва "Беларусь". З другой паловы 60-х гадоў яго дзейнасць у галіне народна-аркестравай музыкі значна актывізавалася. Пад рубрыкай "Мастацкай самадзейнасці" выйшлі тры зборнікі партытур пад назвай "П"есы для народных аркестраў" (35), а таксама "Рэпертуар народных аркестраў" (44). Гэтыя зборнікі адметныя тым, што партытуры напісаны на розны інструментальны састаў аркестраў, што было выпадковым і адлюстроўвала практыку бытавання народных аркестраў у БССР. Так, напрыклад, у "Беларускай польцы" К.Паплаўскага (зборнік 1967 г. выдання) выкарыстаны наступны састаў аркестра: цымбалы, скрыпкі, баяны, акардэон, балалайкі. У "Палескай сюіце" Я.Глебава (1966) – цымбалы, балалайкі, домры, баяны, ударныя. Некаторыя п"есы

---

[1] Белдзяржвыдат заснаваны у 1921 г.

інструментаваны для ансамбляў. Змест названых зборнікаў склалі арыгінальныя творы беларускіх аўтараў або апрацоўкі беларускіх народных мелодый. Пералажэнні для аркестра або ансамбля выканаемы М.Лісіцыным, М.Прашко, Г.Жыхаравым.

У 1968 г. выйшла невялікая брашурка "Рэпертуар народных аркестраў" (45), якую склалі творы беларускіх кампазітараў у інструментоўцы яе складальніка Г.Жыхарава для аркестра наступнага саставу: домрава-балалаечная група, драўляныя духавыя інструменты, баяны, гуслі, ударныя, голас.

Даволі вядомай з"яўляецца серыя "Беларускія узоры", у рамках якой выйшлі зборнікі партытур для цымбальнага аркестра "П"есы для аркестра беларускіх народных інструментаў" (36) і "П"есы для ансамбляў народных інструментаў" (37), складзеныя Я.Гладковым. У зборнік "Беларускія узоры" 1983 г. выпуску (3) уключаны арыгінальныя творы беларускіх кампазітараў, а таксама апрацоўкі вядомых народных мелодый для інструментальных ансамбляў. Скрыпка, кларнет, цымбалы, домры, дудкі, гармонікі, кантрабас выкарыстоўваюцца ў іх у розных варыянтах.

Рэспубліканскім Домам народнай творчасці у 1972 г. былі выдадзены "Метадычныя рэкамендацыі для аркестру і ансамбляў народных інструментаў" М.Прашко (16). Акрамя рэпертуару для розных па саставу ансамбляў і АНІ дадзены метадычныя рэкамендацыі, у якіх аўтар дастаткова падрабязна асвятляе методыку работы над творам з асобнымі выканаўцамі або групамі інструментаў, звяртае ўвагу на поліфанічныя, рытмічныя, дынамічныя і іншыя сродкі музычнай выразнасці.

У апошняе дзесяцігоддзе значна актывізаваў выдавецкую дзейнасць Рэспубліканскі навукова-метадычны цэнтр культуры[1]. Зборнікі партытуры, якія ён выпускае, сталі большымі па аб"ёму, разнастайнасці, зместу і адрасуюцца аркестравым калектывам самага рознага творчага напрамку і ўзроўню выканання. Так, у зборнік "П"есы для АРНІ" (38) увайшлі разнастайныя па характару і стылю творы рускіх, савецкіх і беларускіх кампазітараў. Большасць п"ес інструментаваны яго складальнікам С.Кафанавым.

---

[1] Да 1978 г. ён называўся Рэспубліканскі Дом народнай творчасці, а з 1978 па 1987 год – РНМЦ НТ і КПР, з 1987 г. – РНМЦ культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэпертуарны зборнік "Іграе аркестр народных інструментаў МДПІ імя А.М.Горкага" (8), складзены У.Перацяцькам, змяшчае метадычныя парады заслужанага дзеяча культуры БССР, вядомага музыканта-педагога М.Г.Сошалава і метадычныя указанні па разбору і выкананню кожнага твора У.Перацяцькі. Прастата перакладу партытур, у большасці сваёй беларускіх кампазітараў, робіць іх даступнымі для многіх аркестравых калектываў мастацкай самадзейнасці.

У 1983 г. упершыню ў рэспубліцы быў выдадзены зборнік партытур для аркестра баянаў, складальнік В.А.Рэянт (30). У мінулым гармонік быў вельмі любімым і папулярным музычным інструментам, без якога не абыходзіліся народныя гулянні, святы, абрады, вячоркі. У 70-я гады намецілася зніжэнне увагі і цікавасці да баяна (гармоніка), пачаў уяўляць поўныя цяжкасці набор навучэнцаў у музычныя школы па класу баяна. Думаецца, што развіцце аркестраў баянаў больш шырока магло б адыграць вялікую ролю ў музычным выхаванні дзяцей і моладзі, прывіцці любові да народных інструментаў. Аднак дзейнасць аркестраў гармонікаў (баянаў) стрымлівае адсутнасць неабходнага нотнага матэрыялу. У Беларусі зборнік партытур "П"есы для аркестра баянаў" выдадзены ўпершыню. 50% партытур у ім складаюць творы беларускіх аўтараў. У дадзеных у пачатку зборніка метадычных рэкамендацыях тлумачацца асноўныя рысы стылю, жанр, форма, метрарытмічныя і іншыя тэхніка-выканаўчыя асаблівасці твораў. У канцы рэпертуарнага зборніка дадзена характарыстыка мастацка-выразных асаблівасцей баяннага аркестра, складзеная дацэнтам Дзяржкансерваторыі В.Чабаном. Зборнікі такога роду маюць асветную і педагагічную накіраванасць, таму пажадана працягваць падобнага роду выданні або ствараць пастаянную серыю.

У 1984 г. выдадзены "П"есы для ансамбля цымбалістаў" у суправаджэнні фартэпіяна з метадычнымі рэкамендацыямі М.Міцуль (40) па іх выкананню самадзейнымі і вучэбнымі ансамблямі цымбалістаў.

Вялікае значэнне мела з"яўленне зборніка "Звіняць цымбалы" (5), складальнік М.Казінец. Зборнік змяшчае партытуры арыгінальных твораў савецкіх кампазітараў Д.Смольскага, А.Мдзівані, І.Жыновіча, М.Казінца, І.Чухмана для цымбальнага аркестра: цымбалы, баяны, ударныя, драўляныя духавыя інструменты (флейта, габой, кларнет, у большасць партытур уведзены адна або дзве

беларускія дудкі). Творы гэтага зборніка могуць быць выкананы аркестравымі калектывамі дастаткова высокага музычна-выканаўчага ўзроўню. Выпуск гэтага зборніка мае вялікае значэнне таму, што ў яго ўвайшлі творы з рэпертуару аркестра імя І.Жыновіча, доступ да якіх шырокай самадзейнасці цяжкі, паколькі партытуры твораў, якія выконваюцца гэтым вядучым беларускім АНІ, не выдаюцца.

Зборнік партытур "Папулярныя вакальныя творы ў суправаджэнні АНІ" (19) складзены на аснове рэпертуару народнага АНІ Маладзечанскага ГДК яго кіраўніком Г.Сарока. Рэдактар – А.Аусіевіч. Партытуры разлічаны на наступны састаў аркестра: домры, балалайкі, баяны, гуслі, драўляныя духавыя і ударныя інструменты. Эпізадычна ўводзяцца цымбалы і фартэпіяна. У зборнік уключаны вакальныя творы для сярэдняга жаночага і высокага і сярэдняга мужчынскага голаса.

"П"есы для аркестраў народных інструментаў" (41) змяшчаюць як аркестравыя творы, так і п"есы для салістаў або хору ў суправаджэнні АНІ рускіх, беларускіх і іншых савецкіх аўтараў. Метадычныя рэкамендацыі, у якіх даецца характарыстыка твораў і асаблівасцей выканаўцаў, напісаны М.Солапавым і складальнікам гэтага рэпертуарнага зборніка У.Перацацьным.

Рэпертуарныя зборнікі для дзіцячай аркестравай самадзейнасці

У БССР існуюць як змешаныя па ўзроставаму саставу аркестравыя калектывы, так і дзіцячыя. Дзіцячыя самадзейныя аркестры народных інструментаў арганізуюцца ў палацах і дамах піянераў, дамах культуры і клубах, агульнаадукацыйных школах і ПТВ, пачатковых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах.

Рэпертуарнай літаратуры, адрасаванай спецыяльна дзіцячым самадзейным АНІ, вельмі мала. Гэта "Альбом дзіцячых п"ес і песень" (1) у перакладанні для АРНІ (партытуры і голасу) 1965 г. выдання. У 1960 г. Прафвыдатам выпушчаны "Песні для дзіцячых АНІ" пад агульнай рэдакцыяй С.Дунаеўскага (18). Партытуры гэтага зборніка разлічаны на выкананне салістам або хорам у суправаджэнні розных па інструментальнаму саставу аркестраў і ансамбляў народных інструментаў. Усе творы, змешчаныя ў зборніку, – гэта песні савецкіх кампазітараў і народаў іншых краін. Партытуры дадзены ў аблегчанай рэдакцыі і пад сілу для выканання нават малападрыхтаваным удзельнікам. У гэтым зборніку даюцца



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

рэкамендацыі і метадычная кансультацыя па практычных пытаннях, звязаных са стварэннем інструментальных ансамбляў у піянерскіх лагерях.

Для домрава-балалаечнага саставу выдавецтвам "Муз.Україна" у 1978 г. выпушчаны рэпертуарны зборнік "У час адпачынку" для дзіцячых самадзейных АНІ: партытура і галасы (17). У зборнік увайшлі творы класікі і савецкіх кампазітараў.

У зборнік партытур "Іграе дзіцячы АРНІ", складзены В.Смірновым, уключаны апрацоўкі народных песень, творы класікі і савецкіх кампазітараў у аблегчаным пералажэнні для АРНІ (7).

Ёсць нотная літаратура для аркестраў чатырохструнных домраў, але паколькі ў "чыстым" выглядзе ў БССР такія аркестры не існуюць, нотныя выданні для іх не аналізуюцца. Не ўвайшлі ў агляд таксама творы больш высокай ступені складанасці.

Спадзяемся, што кароткі агляд рэпертуарных зборнікаў для аркестраў народных інструментаў дапаможа кіраўнікам самадзейнасці арыентавацца ў патоку выдадзенай нотнай літаратуры, а бібліяграфічнае апісанне зборнікаў у спісе, які прыкладаецца, будзе выкарыстана для заказаў нотных выданняў па Міжбібліятэчнаму абанементу.

СПІС РЭПЕРТУАРНЫХ ЗБОРНІКАЎ

1. Альбом детских пьес и песен: Переложения для ОРНИ. - Партитура и голосы. - М.: Музгиз, 1955.
2. Антология литературы для ОРНИ /Склад. С.Калабкоў. - М.: Музыка, 1984.
3. Белорусские узоры. - Мн.; Беларусь, 1983.
4. Два белорусских танца для народного оркестра. - Мн., 1961.
5. Звіняць цымбалы: Рэпертуарны зб. для аркестраў бел.нар. інструментаў /Склад.М.А.Казінец. - Мн.: РНМЦ НТ і КПР, 1984.
6. Играет государственный ОРНИ им.Н.Осипова. - Партитура. - Вып.1. - М.: Сов.композитор, 1970; Вып.2. - 1974; Вып.3. - 1982.
7. Играет детский оркестр русских народных инструментов/Склад. В.Смірноў. - Партитура. - Вып.2. - М.: Музыка. 1984.
8. Играет ОНИ МГПИ им.А.М.Горького/Склад.У.Перацецька. - Мн.: РНМЦ НТ і КПР, 1983.
9. Играет оркестр под управлением В.Федосеева. - М.: Сов.композитор, 1973.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

10. Играет ОРНИ Центрального телевидения и Всесоюзного радио. М.: Сов.композитор, 1980.
11. Из репертуара ОРНИ Всесоюзного радио и телевидения. – Партытура. – Вып.1. – М.: Музыка, 1969; Вып.1-5 /Склад. У.Федасееў; Вып.6. –.../Н.Пякрасаў.
12. Из репертуара ОРНИ им.В.Андреева /Склад.М.Сяліцкі. – Партытура. – М.: Музыка, Ленигр.отд-ние, 1976.
13. Из репертуара Государственного ОРНИ им.Н.Осипова. – Партытура. – Вып.1-6. – М.: Музыка, 1970-1978; Вып.1-5 /Склад. В.Гнутаў; Вып.6 /В.Дуброўскі.
14. Из репертуара Государственного академического русского народного хора им.Пятницкого. – Партытура. – М.: Музыка. – 1970; Вып.1-6 /Склад. А.Шырокаў; Вып.7. – .../І.Абзікін.
15. Клубному ОРНИ /Склад В.Віктараў. – Партытура з дадаткам галасоў. – Вып.1. – ... М.: Музыка, 1970.
16. Методические рекомендации для оркестров и ансамблей народных инструментов/Аўтар-складальнік М.Пралко. – Мн.: РДНТ, 1972.
17. На досуге: Репертуарный сборник для детских самодеятельных ОНИ. – Партытура і галасы. – Киев: Муз. Украина, 1978.
18. Песни для детских оркестров народных инструментов "/Агульн. рэд. С.Дунаеўскага. – М.: Профиздат, 1969.
19. Популярные вокальные произведения в сопровождении ОНИ /Склад. Г.Сарока. – Партытура. – Мн.: РНМЦ НТ і КПР, 1986.
20. Пьесы для народных оркестров художественной самодеятельности. – Мн.: Беларусь, 1987.
21. Пьесы для народных оркестров художественной самодеятельности /Інструментоўка М.Лісіцына. – Мн.: Беларусь, 1966.
22. Пьесы для начинающих ОРНИ. – Партытура і галасы. – М.: Сов. композитор, 1959-1963. – Вып.1-3/Склад.А.Дарожкін; Вып.4-5 ... Н.Іваноў; Вып.6 .../А.Дарожкін.
23. Пьесы для начинающих ОРНИ. – Партытура і галасы. – Вып.7-11. – М.: Музыка, 1964-1968.
24. Пьесы для оркестра баянистов /Склад і Інструментоўка Н.Смірнова. – Партытура. – Вып.2. – М.-Л.: Музыка, 1966; Вып.3 – 1972.
25. Пьесы для оркестра баянов /гармонік/ /Агульн. рэд.Я.Максімава. – М.: Сов.композитор, 1972; Вып.1 /Склад.І.Абзікін; Вып.2 /Н.Дзянішка і І.Абзікін; Вып.3 /Б.Акімаў і І.Абзікін;

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКИ

Вып.5 /Б.Акімаў і М.Алфееў; Вып.6 /М.Стаскоў і А.Чарных; Вып.7 /Ан.Гацэнка і А.Суркоў; Вып.9-16 /В.Гаўрылаў.
26. Пьесы для ОНИ /Склад. Г.Кушнер. – Партытура і галасы. – М.: Музгиз, 1963.
27. Пьесы для ОРНИ /Склад. і інструм. М.М.Сяліцкага. – Партытура. – Л.: Музыка, 1971.
28. Пьесы для ОРНИ /Склад. Б.І.Акуловіч. – Партытура. – Л.: Музыка, 1981.
29. Пьесы для ОРНИ /Склад. М.М.Шахматаў, В.Біберган. – Партытура. – Л.: Музыка, 1984 (Мастацкай самадзейнасці).
30. Пьесы для ОРНИ /Склад. М.Шахматаў, Н.Лебедзеў. – Партытура. – Л.: Музыка, 1985 (Мастацкай самадзейнасці).
31. Пьесы для русского оркестра. – Партытура. – М.: Госкультпросветиздат, 1949.
32. Пьесы для самодеятельного ОРНИ /Склад Г.Андрушэнкаў. – Партытура. – Л.: Музыка, 1979.
33. Пьесы для самодеятельного ОРНИ. – Партытура. – Вып.1-7 – М.: Сов.композитор, 1970-1977; Вып.3 /Склад А.Шырокаў; Вып.4 /Л.Любімаў; Вып.5 /Б.Глыбоўскі; Вып.6 /В.Гаўрылаў; Вып.7 – /С.Дунаеўскі.
34. Пьесы для ОНИ /Агульн. рэд. К.Паплаўскага. – Мн.: Госмузиздат БССР, 1959.
35. Пьесы для народных оркестров художественной самодеятельности. – Партытура. – Мн.: Беларусь, 1966, 1967, 1972.
36. Пьесы для оркестра белорусских народных инструментов /Склад. Я.Гладкоў. – Мн.: Беларусь, 1976, 1980.
37. Пьесы для ансамблей народных инструментов /Склад. Я.Гладкоў – Мн.: Беларусь, 1979.
38. Пьесы для ОРНИ /Склад.С.Кафанаў. – Мн.: РНМЦ НТ і КПР, 1985.
39. Пьесы для оркестра баянов /Склад. В.А.Рэлнт. – Мн.: РНМЦ НТ і КПР, 1983.
40. Пьесы для ансамбляў цымбалістаў /Склад.М.Н.Міцуль. – Мн.: РНМЦ НТ і КПР, 1984.
41. Пьесы для аркестраў народных інструментаў /Склад.У.Перацыцька. – Мн.: РНМЦ НТ і КПР, 1988.
42. Пьесы ленинградских композиторов для ОРНИ. – Партытура. – Вып. 1-7 – М.-Л.: Сов.композитор, 1975-1983.
43. Рэпертуар клубного ОРНИ /Склад В.Віктараў. – Партытура з дацаткам галасоў. – Вып.1. – М.: Музыка, 1961-1968 (Мастацкай самадзейнасці).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

44. Репертуар народных оркестров. - Мн.: Беларусь, 1969.
45. Репертуар народных оркестров /Склад. Г.Жыхарау. - Мн., 1968.
46. Сборник пьес для народных инструментов /Склад М.Прашко. - Мн.: Беларусь, 1974.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ